Час дзейнічаць!

# З крэатывам — да выйгрышу




**«ПІН_КОД» тэлеканала «Беларусь 2» сумесна са школай блогераў Media kids для юных творцаў у сацыяльных сетках аб'яўляе спаборніцтва для гледачоў праекта, пераможца якога атрымае новы смартфон!**

Каб узяць удзел у розыгрышы, канкурсанту трэба зняць влог пра сваю школу. Прычым фармат і тэму відэа кожны можа выбіраць самастойна. Будзе гэта рэпартаж з урока, расповед пра цікавыя факты, звязаныя са школай, ці нават пародыя на любімых настаўнікаў — вырашаеце толькі вы. Каманда тэлепраекта дае поўную свабоду выбару, таму ўключайце фантазію і дзейнічайце. Адзіны нюанс: працягласць відэа павінна быць да 1 хвіліны. Вынікі розыгрышу будуць падведзены ў першы дзень асенніх канікулаў — 31 кастрычніка, а значыць, ёсць час для творчых пошукаў і эксперыментаў над іх увасабленнем.

Таксама каманда праекта запускае чэлендж «Запрасі ПІН_КОД у госці». Тэлегледачы цяпер могуць запрасіць здымачную групу любімай праграмы ў свой родны горад альбо вёску. Усё, што для гэтага патрэбна, — расказаць пра сябе і свой населены пункт на афіцыйнай старонцы «ПІН_КОДА» ў «Інстаграме» (@pin_kod_official). І, вядома, да аўтараў самых цікавых гісторый «Беларусь 2» прыедзе ў госці. А каб зрабіць вандроўку па краіне разнастайнай, «пінкодаўцы» прыдумалі цікавінку — кожны ўдзельнік чэленджу будзе перадаваць памятны падарунак для наступнага, тым самым гледачы з розных куткоў краіны змогуць парадаваць адзін аднаго прыемнымі сюрпрызамі.

Далучайцеся, і няхай фантазія і фартуна будуць на вашым баку!

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 147

**На маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках-64, які адбыўся ў Балгарыі (Кранева) з 20 да 31 жніўня, у першыя дні спаборніцтваў прайшлі хуткая і маланкавая праграмы. Чэмпіёнамі свету па хуткай гульні сталі Георгій Выдзерка, Аляксей Паўлючэнка, Яна Якубовіч, Дар'я Нікіфарава і Яўгенія Швед! У маланкавай перамаглі Г. Выдзерка, Я. Якубовіч, А. Сіняк і Я. Швед. Яшчэ 19 сярэбраных і бронзавых медалёў у розных узростах заваявалі нашы шашысты ў гэтых праграмах.**

Па шашках-64 кампазіцыі складзены вядучым аддзела.

**№ 98**



**№ 98**

**Белыя простыя шашкі:** c1, d2, f2, h2, a3, e3, d4, c5 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, h4, a5, g5, f6, a7, e7, g7 (8)

**№ 99**

**Белыя простыя шашкі:** e1, g1, b2, d2, f2 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, d4, c5, g5, d6, c7 (7)

**№ 100**

**Белыя простыя шашкі:** h2, d4, f4, h4, e5 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, b4, c5, b6, c7, e7, g7 (7)

Наступныя кампазіцыі ў шашкі-100 складзены Валерыем Кручковым (Украіна).

**№ 101**

**Белыя простыя шашкі:** 49, 38, 18, 19, 20, 13, 14, 9 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 37, 39, 40, 32, 27, 3, 4 (7)

**№ 102**

**Белыя простыя шашкі:** 41, 33, 30, 22, 23, 17, 18, 19, 13 (9)

**Чорныя простыя шашкі:** 44, 37, 39, 32, 35, 28, 24, 10 (8)

**№ 103**

**Белыя простыя шашкі:** 41, 31, 32, 34, 28, 17, 19, 11 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 43, 35, 26, 18, 12, 6, 8, 10 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Выпуск № 146 ад 20.08.21.**

**№ 92** 1. e3-d4 g3:e5 2. d4-c5 h6:f4

[ 2...f6:h4 3. c3-b4 a5:c3 4. b2:a5 h8-g7 ]

3. c5-d6 e7:c5 4.c3-b4 a5:c3 5. b2:e3 +

**№ 93** Белыя c1,e1, f2, e3, f4;

чорныя a5, g5, d6, h6, d8, P: g3 (e7A)h4 (f6) e5 (d2) e3 (b4) d2 (a3) c3x

A (h4) d4.g3 (e7B) de5 (c5) d6 (f6) b4. h4x B (c5) b6.h4 (e7) hg5 (b6) b2 (c5) c3 (d6) f6x +.

**№ 94** 1. e3-d4 c5:c1 2. a7:e7 f8:d6 3. c3-d4 e5:c3 4. g5-h6 c1:g5 5. h6:h6 h2:f4 6. h6:c1 a3-b2 7. c1:a3 +

**№ 91** 1. d6-e7 f8:d2 2. h6:f8 e3:c5 3. f8:e1 f6-g5 4. g1:e3 g3-h2 5. e1-g3 h2:d2 6. c1:e3 g5-h4 7. e3-f4 h4-g3 8. f4:h2 +

**№ 95** 1. c5-b6 a5:e5 2. f6:f2 h8:f6 3. f2-g3 c3:a5 4. h4-g5 f6:f2 5. g1:a3 +

**№ 96** 1. c7-d8

[ 1. c7-b8 a5:e5 2. h6-g7 f4:f8 3. b8:e7 f8:d6 4. g1:e3 d6-e5 ]

1. ..a5:e5 2. d8-f6 e5:g7 3. h6:f8 f4:h6 4. f8:g5 h6:f4 5. g1:g5 +

**№ 97** 1. b4-c5 b6:b2 2. f2-e3 e1:f2 3. g1:a3 +

Выпуск № 144 2021-07-23 № 85 ПР: 25,17,38,41,1+ знайшоў Г. Андрэеў

Першыя дакладныя адказы даслалі В. Бандарык (Мінскі р-н), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Рашэцін (Ашмяны).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Адзначаем свята пісьменства на «Беларусь 3»

**Да Дня беларускага пісьменства сацыякультурны тэлеканал падрыхтаваў тэматычны эфір. Тут пакажуць кінастужкі і спектаклі паводле твораў айчынных пісьменнікаў і прадставяць новы адукацыйна-пазнавальны праект «Кафедра», а 4 і 5 верасня разам са здымачнай групай «Беларусь 3» гледачы змогуць наведаць горад Капыль і ўбачыць прамыя трансляцыі з месца правядзення кніжнага свята.**



Штогод з 1994-га свята пісьменства, якое традыцыйна адзначаецца ў першую нядзелю верасня, вандруе па гістарычных цэнтрах беларускай культуры, навукі і літаратуры. Так, яно ўжо пакінула свой след у гісторыі многіх беларускіх гарадоў, сярод якіх Полацк, Бялынічы, Хойнікі, Шклоў, Тураў, Нясвіж і іншыя. Сёлета эстафету ўрачыстых цырымоній і тэматычных мерапрыемстваў прымае горад Капыль Мінскай вобласці. Здымачная група тэлеканала «Беларусь 3» наведае ўсе святочныя пляцоўкі, пазнаёміцца з гасцямі і выступоўцамі і пакажа ў выпусках праграмы «Навіны культуры», як ушаноўваецца гісторыка-культурная і духоўная спадчына Капыльшчыны. Дарэчы, з верасня праект будзе выходзіць у новым графічным афармленні.

Акрамя таго, эфір сацыякультурнага тэлеканала з 3 да 5 верасня дапоўніцца гульнявымі кінастужкамі і мультфільмамі вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» і тэатральнымі пастаноўкамі, створанымі паводле мастацкіх тэкстаў беларускіх літаратараў — Алеся Адамовіча, Уладзіміра Караткевіча, Івана Мележа, Андрэя Макаёнка, Кандрата Крапівы, Францішка Аляхновіча, Івана Шамякіна, Аляксея Дударава, Янкі Маўра і Янкі Купалы. Так, убачым спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Адамавы жарты», «Паўлінку» ад Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, драматычную баладу «Не пакідай мяне...» ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Змогуць пераглядзець кінааматары і некаторыя фільмы вытворчасці «Беларусьфільма», у аснове якіх творы айчыннай класікі, а менавіта «Дзікае паляванне караля Стаха» (1979), сатырычная камедыя «Хто смяецца апошнім» (1954), «Вазьму твой боль» (1980), «Людзі на балоце» (1981), «Белыя росы» (1983), «Лыжка для салдата» (2015). У тэматычных праграмах прагучаць гісторыі жыццёвага і творчага лёсу класікаў і сучасных майстроў слова. У прыватнасці, згадаем Кандрата Крапіву ў выпуску праграмы «Люблю і памятаю», Івана Мележа і яго перарваныя хронікі ў праекце «Запіскі на палях», а таксама трапім на сустрэчу Навума Гальпяровіча з беларускім пісьменнікам Віктарам Шніпам, які стане госцем «Суразмоўцаў».

5 верасня а 12 гадзіне на «Беларусь 3» адбудзецца прамая трансляцыя ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства, увечары ў 19.30 канал пакажа канцэртную праграму закрыцця культурнага форуму. А яшчэ ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала днём гледачоў чакае прэм'ера цыкла адукацыйна-пазнавальных лекцый «Кафедра».

— Мы бачым, што фармат адукацыйных лекцый шмат гадоў застаецца вельмі запатрабаваным у культурным асяроддзі, збірае мноства зацікаўленых слухачоў як у арт-прасторах, так і анлайн, — распавядае **галоўны дырэктар сацыякультурнага тэлеканала Наталля МАРЫНАВА.** — Цягам часу гэты фармат таксама выдатна зарэкамендаваў сябе ў эфіры «Беларусь 3» і дапоўніў шэраг нашых фірменных пазнавальных праграм пра знакамітых творцаў, беларускае выяўленчае мастацтва, музыку, кіно, архітэктуру і нематэрыяльную гісторыка-культурную спадчыну. Новы праект «Кафедра» — гэта цыкл паўнавартасных тэлевізійных лекцый ад вядомых беларускіх экспертаў, даследчыкаў і мастацтвазнаўцаў, першыя выпускі якога мы прысвячаем гістарычным этапам кнігадрукарства на беларускіх землях і адмыслова прымяркоўваем да Дня беларускага пісьменства.

У святочны дзень на «Беларусь 3» у 17.35 адбудзецца паказ адразу дзвюх лекцый з цыкла «Кафедра»: «Чаму кнігі прамавугольныя і прычым тут козы» і «Брэст, Авідзій і друкарскія станкі: як набывалі кнігу ў XVI стагоддзі». Далей праект будзе выходзіць у эфір па нядзелях.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**